# Ад аўтара

Дапаможнік змяшчае планы-канспекты ўрокаў па беларускай літаратуры ў 11 класе і мае на мэце дапамагчы настаўніку наладзіць адукацыйны працэс. Урокі распрацаваны ў адпаведнасці з дзеючай вучэбнай праграмай (НІА, 2022) для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, з улікам вывучэння прадмета на базавым узроўні. У дапаможніку рэалізуюцца патрабаванні адукацыйнага стандарту па беларускай літаратуры, вызначаецца паслядоўнасць урокаў, у тым ліку кантрольных работ і ўрокаў развіцця маўлення.

Размеркаванне вучэбнага матэрыялу прыводзіцца ў адпаведнасці са зместам і структурай вучэбнага дапаможніка «Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. П. Мельнікава, Г. М. Ішчанка. Мінск, 2021».

Распрацаваныя планы-канспекты ўрокаў накіраваны на рэалізацыю ў адукацыйным працэсе па беларускай літаратуры кампетэнтнаснага падыходу, а таксама выхаваўчага патэнцыялу вучэбнага прадмета. Змест і формы правядзення ўрокаў прадугледжваюць уключэнне вучняў у розныя віды дзейнасці, выкананне імі разнастайных заданняў, накіраваных на аналіз жыццёвых сітуацый, у якіх апынуліся літаратурныя героі, з мэтай пераймання арыенціраў для ўласных паводзін у розных жыццёвых абставінах.

Пры планаванні ўрокаў выкарыстана шмат візуалізаванага вучэбнага матэрыялу (гексы, кросэнсы, медыяплакаты, інтэлект-карты, табліцы, кластары і г. д.), элементы тэхналогіі крытычнага мыслення, праблемнага навучання, актыўнай ацэнкі і інш. У канцы дапаможніка змешчаны дадатак да некаторых урокаў у адпаведнасці са спасылкамі.

Метадычныя распрацоўкі носяць рэкамендацыйны характар. Маладыя педагогі могуць выкарыстоўваць гатовыя распрацоўкі як у поўным аб'ёме, так і часткова, уключаючы неабходныя элементы ва ўласны план урока. Спадзяемся, што дасведчаны, творчы педагог зможа знайсці ў дапаможніку новыя ідэі, падказкі і эфектыўна выкарыстоўваць іх у сваёй працы.

## УРОК 21

# Міхась Стральцоў. Апавяданне «Сена на асфальце»

**Навучальная мэта ўрока:**

Мяркуецца, што да заканчэння ўрока вучні:

- будуць ведаць асноўныя этапы жыцця і творчасці Міхася Стральцова, змест і тэматыку апавядання «Сена на асфальце»;
- будуць умець вызначаць структурныя адметнасці апавядання, яго лірызм, даваць суб'ектыўную ацэнку прачытанага.

**Задачы асобаснага развіцця:** сродкамі матэрыялу ўрока садзейнічаць выхаванню ў адзінаццацікласнікаў гуманістычных ідэалаў.

**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік, ілюстрацыі да прыёма «Што б гэта значыла?», партрэты пісьменнікаў — прадстаўнікоў філалагічнага пакалення, прэзентацыя «Жыццё і творчасць Міхася Стральцова», ватман, рознакаляровыя маркеры.

**Тып урока:** урок вывучэння новага матэрыялу.

## Ход урока

### I. Арганізацыйны этап.

### II. Матывацыйна-мэтавы этап.

**Прыём «Што б гэта значыла?»**

Настаўнік прапануе вучням абмеркаваць і пракаменціраваць наступныя выявы:





(Настаўніку пажадана падвесці вучняў да высновы, што вялікая колькасць гарадскіх жыхароў, асабліва пакаленне іх бабуль, можа, і бацькоў, — гэта выхадцы з вёскі. І хоць сёння для гараджан не існуе праблемы купіць зеляніну ці бульбу, але сялянскія карані прымушаюць беларусаў песціць вясной на падваконні пёркі цыбулі, рабіць запасы на зіму і інш.)

Настаўнік паведамляе тэму ўрока, прапануе абмеркаваць выказванне Пятра Васючэнкі пра Міхася Стральцова ў вучэбным дапаможніку на с. 101 і вызначыць мэты на ўрок.

**Прыкладныя мэты ўрока на мове вучняў:**

1) агучу прэзентацыю «Жыццё і творчасць Міхася Стральцова»;

2) выразна прачытаю ўрыўкі з апавядання «Сена на асфальце», якія адлюстроўваюць тэматыку твора;

3) назаву тры структурныя адметнасці апавядання, вызначу іх ролю;

4) абгрунтую, што апавяданне «Сена на асфальце» адносіцца да лірычнай прозы.

**III. Этап актуалізацыі суб'ектнага вопыту.**

**Прыём «Пара па парах!».**

Настаўнік прапануе абмеркаваць у парах наступныя пытанні:

• Назавіце пісьменнікаў на фотаздымках. Што іх аб'ядноўвае?






*(Рыгор Барадулін, Міхась Стральцоў, Іван Пташнікаў, Анатоль Вярцінскі. Яны з'яўляюцца прадстаўнікамі філалагічнага пакалення і пакалення дзяцей вайны.)*

• Якая тэма стала вызначальнай у іх творчасці?

*(У першую чаргу тэма вайны, бо яны самі «выраслі пад гарматнымі стваламі».)*

**IV. Інфармацыйна-дзейнасны этап.**

**1) Работа ў малых групах. Прыём «Агуч прэзентацыю».**

(Вучні, якія сядзяць за першай партай, паварочваюцца да вучняў, якія сядзяць за другой партай, а вучні, якія сядзяць за трэцяй партай, паварочваюцца да вучняў, якія сядзяць за чацвёртай партай, і г. д. Знаёмяцца са зместам артыкула ў вучэбным дапаможніку на с. 101—104 і агучваюць прэзентацыю «Жыццё і творчасць Міхася Стральцова».)

## Літаратура


1. *Багамолава, А.* Кожны радок крылаты: лінгвічстычныя і экстралінгвістычныя разважанні над паэзіяй Алеся Разанава / А. Багамолава // Роднае слова. — 2007. — № 1. — С. 21—23.

2. *Васілёнак, С. В.* Апавяданне Уладзіміра Сцяпана «Адна капейка» (урок у XI класе) / С. В. Васілёнак // Беларус. мова і літ. — 2019. — № 12. — С. 6—8.

3. Вучэбная праграма для агульнаадукац. устаноў з рус. і беларус. мовамі навучання. Беларуская літаратура: XI клас. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2021.

4. *Герцык, А. В.* Апавяданне Івана Пташнікава «Львы» (урок у XI класе) / А. В. Герцык // Беларус. мова і літ. — 2019. — № 1. — С. 8—12.

5. *Запрудский, Н. И.* Современные школьные технологии / Н. И. Запрудский. — Минск: Сэр-Вит, 2006. — 288 с.

6. *Марчук, Г.* Кветкі правінцыі : раман, навелы, афарызмы / Г. Марчук. — Мінск: Маст. літ., 2004. — 416 с.

7. *Смаль, Вал. М.* Вывучэнне творчасці Івана Чыгрынава / Вал. М. Смаль, Вяч. М. Смаль // Беларус. мова і літ. — 2008. — № 4. — С. 21—30.


---

## Змест


*Ад аўтара* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 1

Урок 21. Міхась Стральцоў. Апавяданне «Сена на асфальце» . . . 2

Урок 22. Міхась Стральцоў. Апавяданне «Сена на асфальце». Псіхалагізм у паказе характараў герояў твора. Сэнс назвы апавядання . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7

Урок 23. Звесткі пра жыццё і творчасць Ніла Гілевіча. Верш «Край мой беларускі, край!..» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11

Урок 24. Ніл Гілевіч. Вершы «Ах, якая над Гайнай купальская ноч!..», «Страціў слова, страціў спадчыннае слова...» . . . 16

Урок 25. Ніл Гілевіч. Раман «Родныя дзеці»: ідэйная накіраванасць, тэматыка, праблематыка, асаблівасці кампазіцыі 21

Урок 26. Ніл Гілевіч. Раман «Родныя дзеці»: вобразная сістэма твора . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26

Урок 27. Іван Чыгрынаў. Апавяданне «Дзівак з Ганчарнай вуліцы» 30

Урок 28. Іван Навуменка. Апавяданне «Сямнаццатай вясной» . . . 34

Урок 29. Звесткі пра жыццё і творчасць Рыгора Барадуліна. Народнасць і самабытнасць паэта . . . . . . . . . . . . . . . . 43
Урок 30. Рыгор Барадулін. Вершы «Чалавек не ўзнікае так...», «Бацьку» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
Урок 31. Рыгор Барадулін. Вершы «Неруш», «Яна адна, зямля вякоў...», «Заспаная раніца мжыстая...» . . . . . . . . . . . 53
Урок 32. Алесь Разанаў. Творы «Радзіма...», «Кожны народ мае...», «У крузе», «Спадчына», «Горад» . . . . . . . . . . . . . 57
Урок 33. Георгій Марчук. Навелы «Канон Гарыні», «Канон Маці» 62
Урок 34. Аляксей Дудараў: кароткія звесткі з жыцця і творчасці драматурга. П'еса «Князь Вітаўт» . . . . . . . . . . . . . . 69
Урок 35. Аляксей Дудараў. Ідэйны змест, тэматыка і праблематыка п'есы «Князь Вітаўт» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 75
Урок 36. Міхась Башлакоў. Верш «Заркапад», цыкл «Радзіма...» . . . 80
Урок 37. Дадатковае чытанне. Іван Чыгрынаў. Апавяданне «У ціхім тумане» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
Урок 38. Літаратурны працэс у Беларусі на сучасным этапе . . . 90
Урок 39. Сучасная беларуская літаратурная перыёдыка . . . . . . 93
Урок 40. Творчасць пісьменнікаў-землякоў . . . . . . . . . . . . . . 96
Урокі 41—42. Агляд сучаснай беларускай паэзіі . . . . . . . . . . 100
Урок 43. Развіццё сучаснай беларускай прозы. Агляд . . . . . . . . 103
Урок 44. Уладзімір Сцяпан. Апавяданне «Адна капейка» . . . . . . 106
Урок 45. Янка Сіпакоў. Аповесць «Кулак» . . . . . . . . . . . . . . 110
Урок 46. Іван Пташнікаў. Апавяданне «Львы» . . . . . . . . . . . . 113
Урокі 47—48. Сачыненне-разважанне па творах сучаснай беларускай літаратуры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 117
Урок 49. Дадатковае чытанне. Васіль Быкаў. Аповесць «Сотнікаў» 119
Урок 50. Развіццё сучаснай беларускай драматургіі. Агляд . . . . . 122
Урок 51. Уладзімір Сауліч. Ідэйны змест, тэматыка і праблематыка п'есы «Сабака з залатым зубам» . . . . . . . . . . . . . . . 127
Урок 52. Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год . . . . . . 130
Урок 53 — рэзервовыя гадзіны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 134

*ДАДАТАК* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135

*Літаратура* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 147

Зак. 49/2714181-1.